© PDF: Kamunikat.org 2010 © Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2010

Халодная вясна дзевяноста сёмага (стар. 2, 4)
Катастрофа на ЧАЭС была запланавана (стар. 4)

СВАБОДА

Год заснавання 1902
Выходзіць з 1990
Галоўны рэдактар Ігар Германчук
Заснавальнік і выдавец Павел Жук
Наклад 90.000
Адрас рэдакцыі:
220088, Мінск, вул.Іванаўская, 56
Тэл./факс 2 362 441

Пятніца, 25 красавіка 1997 г. № 45 Кошт свабодны

«Шлях-97»

Заўтра ў Мінску апазіцыйныя сілы праводзяць акцыю «Чарнобыльскі шлях». Удзельнікі збіраюцца ў 15:00 каля Акадэміі навук

Як ужо паведамляла СВАБОДА, гарадскія ўлады далі дазвол арганізатарам на правядзенне шэсця і мітынгу 26 красавіка. Прадстаўнікі аб'яднанай апазіцыі спадзяюцца, што ў «Чарнобыльскім шляху-97» прыме ўдзел не менш за 20 тысяч чалавек. На думку намесніка старшыні БНФ Юрыя Хадыкі, дзень 26 красавіка павінен стаць не толькі днём памяці ахвяраў Чарнобыльскай катастрофы, але і днём усеагульнага пратэсту супраць антынацыянальнай палітыкі рэжыму Лукашэнкі. *«На ўдзельнікаў дэманстрацыі* — сказаў Ю.Хадыка, — *кладзецца вялікая адказнасць па падтрыманні парадку падчас руху калоны, бо сіла апазіцыі ў арганізаванасці. Для таго, каб «Чарнобыльскі шлях» стаў сапраўднай акцыяй грамадзянскага непадпарадкавання ўладам, яго ўдзельнікі павінны праявіць максімальную дысцыплінаванасць».*

Альгерд НЕВЯРОЎСКІ

На здымку: так пачынаўся «Чарнобыльскі шлях-96»

Маладыя «хадакі» ідуць на Мінск

Актывісты маладзёжнай арганізацыі «Грамадзянскі форум» праводзяць незвычайную акцыю, прымеркаваную да 11-й гадавіны чарнобыльскай катастрофы.

«Хадакі» пройдуць шлях ад горада Чэрыкава да сталіцы Беларусі праз Магілёў і 7 раённых цэнтраў. Чатыры маладыя хлопцы ўчора выйшлі з Чэрыкава. У Магілёве да іх збіраюцца далучыцца яшчэ 5—7 студэнтаў. «Хадакі» мяркуюць быць у Мінску 26 красавіка і прыняць удзел у сталічным Чарнобыльскім шэсці.

Мэта акцыі — прыцягнуць увагу грамадскасці да чарнобыльскіх праблем і выказаць салідарнасць са студэнтамі, якіх накіроўваюць супраць іх волі ў радыяцыйна забруджаную зону.

Міхаіл БАШУРА

Амерыканскі пасол хутка вернецца

Як паведамілі ў амерыканскай амбасадзе ў Мінску, бліжэйшым часам Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол ЗША Кенет Ялавіц вернецца у Мінск.

Сп. Ялавіц быў адкліканы ў Вашынгтон 27 сакавіка гэтага года *«для кансультацый»*. 17 красавіка міністр замежных справаў Беларусі Іван Антановіч заявіў, што пасол ЗША мае намер прыехаць у Мінск і ўручыць беларускаму кіраўніцтву ліст прэзідэнта Біла Клінтана. Аднак у амбасадзе ЗША пацвердзілі толькі тое, што вяртанне спадара Ялавіца чакаецца самым бліжэйшым часам, але дакладная дата пакуль невядомая.

БелаПАН

Беларускі генерал паехаў у NATO

Начальнік Галоўнага штаба Узброеных сілаў Беларусі, першы намеснік міністра абароны генерал-лейтэнант Міхаіл Казлоў выехаў у Брусель, у штаб-кватэру *NATO*.

Як паведамілі ў прэс-службе беларускага ваеннага ведамства, Міхаіл Казлоў возьме ўдзел у паседжанні Ваеннага камітэта начальнікаў генеральных штабоў узброеных сіл дзяржаваў-удзельніц *NATO* і ў штогадовай канферэнцыі *«Адаптацыя NATO — Дзейнасць абноўленага NATO — Перспектывы камандавання Аб'яднанымі ўзброенымі сіламі NATO ў Еўропе»*. Візіт начальніка Галоўнага штаба ўзброеных сілаў ажыццяўляецца ў рамках праграмы «Партнёрства дзеля міру» і завершыцца 26 красавіка.

БелаПАН

Сатаністы ў Бярозаўцы

У мінулую нядзелю пасля вячэрняй службы ў касцёле сотні вернікаў пасёлка Бярозаўка Лідскага раёна са свечкамі накіраваліся на могілкі.

Так людзі выказалі свае адносіны да нечуванага ў гэтых мясцінах **вандалізму. Напярэдадні** ноччу невядомыя зламыснікі паскідалі з магільных пастаментаў і пашкодзілі звыш 100 помнікаў. А вялікі драўляны крыж, каля якога ў цэнтры могілак адбываліся маленні, сатаністы прынеслі да жылога дома, павесіўшы на хрысціянскі сімвал забітага ката.

А.ВАЛОШКА

Яшчэ раз пра «лукамол»

Першы сакратар Беларускага саюза моладзі заявіў, што рашэнне аб стварэнні новай маладзёжнай арганізацыі «патрыятычнага кірунку» з'яўляецца памылковым.

У XXXIII з'ездзе Беларускага саюза моладзі (БСМ) удзельнічалі 97 са 109 дэлегатаў. З дакладам выступіў першы сакратар БСМ Сяргей Даронін. На яго думку, выхаванне патрыятызму пачынаецца не па ўказцы палітыкаў, а з адраджэння цікавасці да гісторыі і культуры народа Беларусі.

БелаПАН

Будзем дружыць з Карэяй па-новаму

Як вядома, дэлегацыя Беларусі на чале з прэзідэнтам Лукашэнкам праводзіць афіцыйную паездку па краінах Далёкага Усходу. Завяршыўшы візіт у Паўднёвую Карэю, цяпер група дзяржаўных кіраўнікоў знаходзіцца ў В'етнаме. У нядзелю яны вылятаюць у Кітай.

Візіт у Карэю скончыўся наборам дзяжурных заяваў і агульных дакументаў. Міністры замежных справаў Рэспублікі Карэя і Беларусі падпісалі пагадненне аб заахвочванні і абароне інвестыцый, а таксама пратакол аб супрацоўніцтве паміж знешнепалітычнымі ведамствамі. Наконт іншых эканамічных дакументаў — аб гандлёвым супрацоўніцтве, аб эканамічным і навукова-тэхнічным узаемадзеянні, аб пазбяганні двайнога падаткаабкладання — бакі ўсяго толькі выказалі жаданне *«паскорыць перамовы»*.

Па выніках візіту прэзідэнт Карэйскай Рэспублікі Кім Ён Сам і А.Лукашэнка падпісалі сумесную заяву. У дакуменце адзначаецца, што *«сустрэча на ўзроўні кіраўнікоў дзяржаваў азнаменавала пачатак новага этапа дружбы і супрацоўніцтва паміж Беларуссю і Паўднёвай Карэяй»* («стары» этап, трэба разумець, закончыўся). Лукашэнка падтрымаў імкненне кіраўніцтва Паўднёвай Карэі ажыццявіць мірнае аб'яднанне Карэйскага паўвострава, а Кім Ён Сам *«прыняў да ведама»* ініцыятыву Беларусі аб стварэнні без'ядзернай зоны ў Цэнтральнай і Усходняй Еўропе. Кім Ён Сам прыняў запрашэнне Аляксандра Лукашэнкі наведаць Рэспубліку Беларусь з афіцыйным візітам. Беларускі прэзідэнт заявіў аб намеры Мінска прызначыць у бліжэйшы час пасла ў Рэспубліцы Карэя.

27 красавіка беларуская дэлегацыя адправіцца з в'етнамскай сталіцы Ханоя ў Шэньчжэнь (КНР), дзе наведае прамысловую зону і зробіць экскурсію па горадзе. На 28 красавіка, ужо ў Пекіне, запланаваныя перамовы з вышэйшымі службовымі асобамі Кітая на чале з лідэрам КНР Цзян Цзэмінем. Увечары таго ж дня дэлегацыя вылеціць у Мінск.

БелаПАН

Хрыстос уваскрос!

У нядзелю вернікі праваслаўнай канфесіі адзначаюць свята светлага Уваскрасення Хрыстовага. У суботу ў цэрквах будзе адбывацца асвячэнне велікодных яек, булак, солі... На ўсяночным набажэнстве шмат разоў будуць гучаць словы радасці — Хрыстос Уваскрос!

Нядзеля і панядзелак — дні святочных застолляў, віншаванняў, вясёлых спаборніцтваў на самае моцнае яйка. Разам з іншымі чытачамі СВАБОДЫ будуць святкаваць работнікі друкарні і пошты. Рэдакцыя шчыра ўсіх віншуе.

Наступны нумар СВАБОДЫ выйдзе ў сераду, 30 красавіка.

Расклейваць улёткі пра СВАБОДУ можна

«Заслушав участвующих в деле лиц, изучив письменные материалы дела, судья приходит к следующему. Согласно Декрету Президента РБ № 5 «О собраниях, митингах, уличных шествиях, демонстрациях и пикетировании в РБ» под его действие не попадает расклеивание рекламных плакатов газеты «Свобода»... Новикова Дениса Анатольевича от административной ответственности освободить, дело прекратить за отсутствием состава...»

Хочаш ведаць
ПРАЎДУ?
Выпісвай газету
СВАБОДА
Падпісны індэкс 63887

Такі апраўдальны прысуд атрымаў студэнт Магілёўскага вучылішча культуры Дзяніс Новікаў, які быў затрыманы міліцыяй падчас расклейвання рэкламных улётак «Хочаш ведаць праўду? Выпісвай газету СВАБОДА. На судзе высветлілася, што Новікаў нічога супрацьзаконнага не рабіў, грамадскі парадак не парушаў, супраціўлення пры затрыманні не аказваў. Суддзя Ленінскага райсуда Магілёва А.Яфрэмаў вымушаны быў апраўдаць маладога хлопца. Аднак дзіўна, што міліцыянтам суд нават не вынес ніякага папярэджання за відавочнае злоўжыванне ўладаю.

Сымон ГЛАЗШТЭЙН

Кошты

З 23 КРАСАВІКА ў Беларусі зноў падаражала белая гарэлка — у сярэднім на 15%. Паўлітра «Пшанічнай» каштуе цяпер 40.600 рублёў, а «Белая Русь» — 45.200 рублёў.

Падарункі

У СЕУЛЕ ПРЭЗІДЭНТ ЛУКАШЭНКА атрымаў у падарунак аўтамабіль ад паўднёвакарэйскай кампаніі «Дэу», з кіраўніцтвам якой ён сустракаўся ў мінулую сераду.

Візіты

УРАДАВАЯ ДЭЛЕГАЦЫЯ на чале з віцэ-прэм'ерам Генадзем Навіцкім возьме ўдзел у працы XVI сесіі камісіі ААН па населеных пунктах, якая пройдзе 26 красавіка — 7 траўня ў горадзе Найробі (Кенія).

Кантакты

ГРУПА АФІЦЭРАЎ Нацыянальнай гвардыі ЗША (штат Юта) на чале з палкоўнікам Рысам Стайнам увесь гэты тыдзень знаходзілася ў Мінску. У міністэрстве абароны амерыканскія вайскоўцы абмяркоўвалі са сваімі калегамі пытанні, якія датычаць працы Цэнтра грамадскіх сувязяў ваеннага ведамства. Афіцэры Нацыянальнай гвардыі падзяліліся вопытам узаемадзеяння з грамадскасцю і сродкамі масавай інфармацыі.

Цэнзура

МІНІСТЭРСТВА СУВЯЗІ праводзіць перазаключэнне дагавораў з карыстальнікамі тэлефоннай сувязі. У тэкст дагавора ўзору 1997 года міністэрства ўключыла новыя палажэнні. Абанент павінен *«не дапускаць выкарыстання тэлефоннай сувязі ў мэтах, што супярэчаць дзяржаўным інтарэсам і грамадскаму парадку»*. Што ўсё гэта азначае — не расшыфроўваецца, аднак пры парушэнні прадпрыемства сувязі мае права спыніць дзеянне дагавора — адключыць тэлефон.

Праждэкт

УРАД ПРЫНЯЎ ПАСТАНОВУ «Аб дзяржаўнай праграме занятасці насельніцтва Рэспублікі Беларусь на 1997 год». Прадугледжваецца, што колькасць беспрацоўных у краіне на 1 студзеня 1998 года не павінна перавышаць 130 тысяч чалавек, або 2,8% працаздольнага насельніцтва.

Страйк

У КАЛГАСЕ «БЕЛАРУСЬ» Іўеўскага раёна адзін дзень баставалі механізатары, патрабуючы выплаціць зарплату. За тры апошнія месяцы ім дагэтуль не заплацілі грошы. Забастоўка скончылася адстаўкай старшыні калгаса.

Помнікі

У ДЗЕНЬ НАРАДЖЭННЯ ЛЕНІНА некаторыя помнікі правадыру атрымалі дадатковыя элементы. У Магілёве, напрыклад, на помніку каля завода штучнага валакна бетонны ленінскі лоб аздобілі свастыкай і надпісам «кат». А ў Светлагорску ў двары адной школы перад помнікам юнаму Ільічу на асфальце з'явіўся надпіс: «Спасибо Каплан».

Святы

БЯСПЛАТНА БУДУЦЬ ЕЗДЗІЦЬ на гарадскім транспарце працоўныя Бабруйска ў святочны дзень 1 Мая. Так вырашыў мясцовы гарвыканкам. Во ўжо працоўныя накатаюцца!

Канверсія

БЫЛЫЯ ВАЙСКОВЫЯ КАЗАРМЫ ў Быхаве будуць перарабляць у жылыя 10—20-кватэрныя дамы.

© PDF: Kamunikat.org 2010 © Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2010

Расійскія антыфашысты пройдуць «Чарнобыльскім шляхам»

Маскоўская арганізацыя «Антыфашысцкае маладзёжнае дзеянне» (АМД), вядомая сваім супрацоўніцтвам з Сяргеем Кавалёвым, Ягорам Гайдарам, Ірынай Хакамадай і іншымі расійскімі палітыкамі ліберальнага накірунку, стварыла некалькі «інтэрнацыянальных брыгад» супраціву аўтарытарнаму рэжыму Лукашэнкі.

Каля 40 чалавек актывістаў толькі ад АМД выказалі жаданне 26 красавіка ўзяць удзел у «Чарнобыльскім шляху». Такім чынам яны хочуць прадэманстраваць салідарнасць і падтрымку беларускай апазіцыі. Вырашана, што расійскія антыфашысты пройдуць разам з агульнай калонай дэманстрантаў і будуць несці транспаранты «Беларуси — да, Лукашенко — нет!», «Российская молодёжь против новой империи» і «Жыве Беларусь!». Дарэчы, яны плануюць выйсці на шэсце з расійскімі дзяржаўнымі сцягамі, што можа не спадабацца некаторым беларускім удзельнікам.

У склад антыфашысцкіх «інтэрнацыянальных брыгад» таксама ўвойдуць прадстаўнікі іншых маладзёжных дэмакратычных арганізацый Расіі і беларускай дыяспары ў Маскве. Як паведаміў газеце СВАБОДА старшыня «Антыфашысцкага маладзёжнага дзеяння» Пётр Казначэеў, у выпадку якіх-небудзь інцыдэнтаў з уладамі ў Мінску АМД выкарыстае свае шырокія сувязі не толькі ў Беларусі і Расіі, але і ў замежных краінах. На пытанне, ці памятаюць расіяне пра арышты членаў УНА-УНСО ў Мінску пасля мінулага «Чарнобыльскага шляху», Пётр Казначэеў адказаў, што інтэрнацыянальныя брыгады не будуць прадпрымаць ніякіх радыкальных дзеянняў кшталту перакульвання машын, таму ім баяцца няма чаго. Паводле папярэдняга сцэнарыя, прадстаўнік АМД прывітае ўсіх удзельнікаў акцыі ад імя дэмакратычнай Расіі на мітынгу каля Палаца спорту.

Наста СЯЛІЦКАЯ

«Пежо» стаяць

Мінская дзяржаўтаінспекцыя забараніла фірме «Сервіс-кар» выпускаць на маршруты аўтамабілі «Пежо».

У сераду нарады міліцыі спынялі ў горадзе вадзіцеляў гэтых таксі, забіралі ў іх правы і такім чынам паставілі ўсе таксоўкі «Пежо» на прыкол. Прычына ў тым, што дзяржаўтаінспекцыі не падабаецца знешні выгляд аўтамабіляў (у прыватнасці, жоўтыя палосы ўздоўж кузава і шырокія плафоны наверсе машын). Чым кіравалася сталічная ДАІ, прымаючы такое рашэнне, можна толькі здагадвацца, бо ніякіх афіцыйных каментараў ад кіраўніцтва ДАІ Мінгарвыканкама рэдакцыі СВАБОДЫ атрымаць не ўдалося. Кажуць, што ДАІ ўгледзела ў знешнім афармленні французскіх аўтамабіляў падабенства з патрульнымі машынамі аўтаінспекцыі.

Закрытае акцыянернае таварыства «Сервіс-кар» працуе ў Мінску з ліпеня мінулага года, і ніякіх прэтэнзіяў да фірмы з боку ўладаў да апошняга часу не было. У распараджэнні прадпрыемства знаходзіцца 50 новых машын «Пежо», якія па якасці і камфорце значна пераўзыходзяць «Волгі» дзяржаўных таксапаркаў. Не выключана, што «наезд» на «Сервіс-кар» быў ініцыяваны менш удачлівымі канкурэнтамі.

Альгерд НЕВЯРОЎСКІ

На здымку: мінская ДАІ паставіла таксоўкі «Пежо» на прыкол.

Мэр да народа не выйшаў

Гродзенскія ўлады ліквідавалі самавольны рынак, які існаваў некалькі гадоў на вул. Паліграфістаў.

Тут, расклаўшы на асфальце рэчы, гандлявалі гараджане, якім не засталося месца на Цэнтральным рынку, што знаходзіцца побач. Каля 80 чалавек накіраваліся да гарвыканкама і каля ганка ўчынілі стыхійны мітынг.

Мітынгоўцы патрабавалі, каб да іх выйшаў мэр А.Пашкевіч, аднак той не пажадаў з імі сустракацца, паслаўшы свайго памочніка. Улады прапануюць гандлярам з вуліцы Паліграфістаў, якіх па колькасці 400 чалавек, частку месцаў на Цэнтральным рынку, хаця ўсе яны выкуплены загадзя і пустуюць толькі ў працоўныя дні, а ў выходныя запоўненыя. Вольныя месцы сапраўды ёсць на іншым гарадскім рынку, але іх намнога менш, чым патрэбна.

З мітынгоўцамі вымушаны былі разбірацца міліцыянты. Спачатку яны спрабавалі высветліць: хто, маўляў, вас падбухторвае бунтаваць? Людзі адказалі, што галоўны падбухторшчык — страўнік, бо заводы працуюць кепска і працы няма. Тады ахоўнікі парадку нагадалі публіцы, што ёю парушаецца вядомы прэзідэнцкі дэкрэт, згодна з якім кожнага з іх можна аштрафаваць на 5 мільёнаў рублёў. Мітынгоўцы вымушаныя былі разыходзіцца, але паабяцалі, што ў суботу на пляц да гарвыканкама прыйдуць усе 400 чалавек.

А.А.

Медицинский центр «Оздоровление и реабилитация»

Лечение алкогольной и табачной зависимости методом кодирования
Экспресс-диагностика беременности малого срока, контрацепция, консультации гинеколога
Лечение заболеваний нервной системы у детей (ночные страхи, энурез, задержки психомоторного и речевого развития, последствия черепно-мозговых травм)
Диагностика и лечение по Фоллю – эффективное лечение заболеваний без лекарств, с использованием электростимуляции и биологически активной жидкости
Консультации врачей-гомеопатов
Массаж

Адрес: г.Минск, проспект Машерова, 75, корп. 1. Контактный телефон 250-67-08
Лицензия Минздрава РБ N 1672, 6.12.94-6.12.99

Холодная весна девяносто седьмого

— Неразрешенные собрания воспрещаются!

— Так вы бы и разрешили!

Околоточный снисходительно усмехнулся:

— Как же это можно: разрешить неразрешенное собрание. Это противозаконно.

— Но ведь, если вы разрешите, оно уже перестает быть неразрешенным, — сказал, подумавши немного, Чикалкин.

— Так-то оно так, — ответил околоточный, еще раз усмехнувшись бестолковости Чикалкина. — Да как же его разрешить, если оно пока неразрешенное?

(А.Аверченко, «Октябрист Чикалкин»).

Вадим КАЗНАЧЕЕВ

Весенние акции протеста пробудили во мне пару довольно интересных вопросов. Вернее, возникали они и раньше, но по ходу «минской весны» как-то обострились. Так вот, имею ли я право, как житель города Минска, просто как человек, двигаться по тротуарам родной столицы в том направлении, в котором я хочу? Или встать на каком-то месте и постоять, если мне так угодно? А если я такой не один, а некоторые из нас даже несут в руках, к примеру, куски бумаги или материи, на которых что-то написано или нарисовано — отменяет ли данный факт это мое право?

«Пить надо меньше! — резонно возразят мне. — Забыл, где живешь?» Действительно, само слово «право» в отношении нынешней Беларуси звучит как-то нелепо. Это иностранцы удивляются — у них там если демонстрация, так обязательно идут по проезжей части, чтобы внимание, значит, на себя обратить. А если по тротуару идти, так на что тут разрешение-то у властей испрашивать? Но то у них — а у нас есть декрет № 5, который, по оценке российской «Литературной газеты», *«делает практически невозможным существование инакомыслия в обществе: прежде чем мыслить иначе, нежели власть, нужно спросить ее разрешение»*. Власть, естественно, такого разрешения обычно не дает. В самых разных точках Беларуси «вертикальщики» мотивируют свои запреты оппозиционных акций одинаково: «мероприятие не будет способствовать сохранению общественной стабильности».

Ясное дело: в понимании диктатуры «стабильность» — это когда пикнуть никто не смеет. Но вот один из уроков «минской весны»: чем более ты, в ходе уличных акций, законопослушен — тем больше у тебя шансов быть задержанным или избитым. Если люди дисциплинированно идут по тротуару или стоят на площади (т.е. с правовой точки зрения не делают ничего предосудительного) — их, по причине малочисленности, хватают довольно быстро. Причем степень антилукашенковской направленности акции на этот процесс не влияет абсолютно: рекордный по скорости захват был осуществлен 20 марта на пл. Якуба Коласа, где студенты выдвигали безобидные требования, не являющиеся напрямую политическими — они протестовали по поводу принудительного распределения на работу. Если же шествие идет по проезжей части (т.е. нарушаются правила уличного движения), то в гущу толпы милиционеры, из соображений собственной безопасности, как правило, не лезут, — однако вполне могут «хапануть» тех, кто с краю, на тротуаре, — в особенности того, кто держится подчеркнуто обособленно, всем видом показывая, что он наблюдатель, а не участник. Вывод: если уж оказался, пусть себе случайно, в месте проведения уличной акции — участвуй в ней активно.

Особенно наглядно милиция стимулировала активность участников уличной акции в самом начале «минской весны», 10 марта. В этот день на площади Независимости собралось несколько тысяч человек, чтобы выразить свое отношение к приезду российской делегации (в основном коммунистов) из Госдумы. Поскольку акция являлась даже не митингом, а пикетом, каковой, как известно, предусматривает мало разнообразия, — людям довольно быстро стало скучно. Ну, повыкрикивали какое-то время традиционные лозунги, ну, сожгли усатое чучело — чем дальше-то заняться? Милиция, правда, с самого начала веселила публику — например, обращалась с требованием «Освободите зеленую зону!» к людям, которые стояли в грязи чуть ли не по колено и ничего отдаленно похожего на зелень под ногами при всем желании узреть не могли. Или еще почище — в момент сжигания усатого уродца из мегафонов звучал настойчивый призыв «Соблюдайте противопожарную безопасность!» Но все это не могло надолго задержать людей, и они потихоньку начали расходиться. Вот тогда-то милиция пошла в наступление и вытеснила людей с площади. Участники акции, которым там стоять уже порядком надоело, с энтузиазмом двинулись по проспекту. Вследствие этого пришли в движение автобусы с омоновцами. ОМОН прежде всего перекрыл ближние и дальние подступы к резиденции диктатора, но части «бойцов» повезло меньше других: в бронежилетах и с дубинками наголо они бегом носились по проспекту, сопровождая колонну, которая несколько раз продефилировала от площади до станции метро «Октябрьская» и обратно. В результате с полным основанием можно сказать, что милиция организовала несанкционированное шествие и устроила дополнительные занятия по физподготовке своим коллегам-спецназовцам.

Через несколько минут эти дубинки пойдут в ход.

Не хочется повторять прописные истины, но Конституция в любой стране — это основа, на которой зиждется государство, которую признают все, независимо от политических разногласий — и правые, и левые. Собственно, наша страна здесь не исключение — Конституцию Беларуси тоже признают и правые, и левые. Но не признает Лукашенко. День Конституции, который, по идее, должен быть праздником общенациональным, Лукашенко превратил в день национального раздора. Наш диктатор, которому, как известно, закон не писан (в т.ч. и Основной), оставил день Конституции в качестве официального праздника, но наполнил его совершенно иным, противоположным, антиконституционным содержанием, воровски подсунув под этот день собственную «конституцию» и одновременно запретив шествие сторонников законной Конституции Республики Беларусь. Маршрут этого шествия был щедро усеян бэсэсэровскими флагами — к 15 марта их нацепляли по Минску в большом количестве, чем дали возможность продемонстрировать отношение к реанимированной Лукашенко символике: она угодила под ноги демонстрантам. Подумалось: какой же все-таки непревзойденный мастер Лукашенко по части нагнетания вражды! Под красными флагами творили чудовищные злодеяния и большевики, и нацисты; их совокупными усилиями под красными флагами были пролиты невиданные в истории человечества моря крови; несмотря на все это, красный флаг продолжает для некоторой части людей оставаться святыней. Возведя красный флаг в ранг государственного, да к тому же еще потворствуя глумлению над национальной символикой, Лукашенко детонировал новый взрыв ненависти к символике советских времен — красно-зеленые флаги демонстранты топчут с таким же удовольствием, с каким прихвостни диктатора, от Титенкова до последнего сержанта, рвут флаги бело-красно-белые.

23 марта, в день празднования годовщины Белорусской Народной Республики, милиция отважилась выйти на демонстрантов с открытым забралом. То есть в буквальном смысле это неверно, поскольку лица милиционеров были прикрыты пластиковыми щитами — но фигурально так выразиться можно: милиция дважды попыталась ворваться в толпу (как водится, в ту ее часть, которая шла по тротуару) — и впервые в истории постсоветской Беларуси получила действенный отпор, вследствие которого несколько милиционеров попали в больницу. План по задержанию, впрочем, в этот день милиция выполнила — но не в ходе шествия, а традиционным образом, устроив «хапун» после митинга.

Во время этого и других «хапунов» в лапы сотрудников «органов беспредела» всегда попадалось большее или меньшее количество случайных прохожих. Иногда их задерживали по ошибке, иногда (в частности, во время молодежных акций) совершенно сознательно, выполняя «план по валу», хватали проходивших мимо и даже вытаскивали из подземных переходов не причастных к акции, но подходящих по возрасту людей, — зная, что за избыток служебного рвения милиционера могут только похвалить, а ответственность все равно никакая не грозит. (Правда, не грозит она только в ближайшее время — кто знает, как после падения диктатуры будут использованы те же видеоматериалы, на которых запечатлены не только демонстранты, но и избивающие их милиционеры.)

Впрочем, если не принимать в расчет ретивость отдельных милиционеров, целенаправленной охоты за случайными прохожими все-таки не велось. До начала апреля.

Первого апреля в Михайловском сквере предполагалось отметить День смеха (с политическим уклоном). Опять же — неужели группа людей не имеет права вместе посмеяться? Но это смотря над чем. В сквер не пустили никого, за исключением журналистов — единственной, получается, категории населения, которой пока еще дозволяется подшучивать над властями. Участники предполагаемой акции стояли на ул.Кирова, где основательно перемешались с прохожими, остановившимися поглазеть на оцепленный милицией сквер, и с просто стоящими на остановках. Через некоторое время милиционеры плотным строем пошли по тротуарам, выдавливая всех людей назад, к вокзалу. Высказывающих неудовольствие по этому поводу (а это делали в первую очередь те, кто ждал транспорта или шел в магазин) — задерживали.

На следующий день (2 апреля), в ходе акции против подписания договора с Россией, уже задерживали всех, кто попадал в поле зрения, а те, кто пробовал объяснить, что они, например, идут с работы — получали дубинкой. Едва ли это можно объяснить инициативой самих милиционеров, которые сорвались с цепи, — скорей всего их сознательно спустили на всех без исключения людей, а не только на участников акции. Диктатура хочет, чтобы у людей выработался рефлекс: увидел какую-то акцию протеста — убегай оттуда со всех ног, потому что тот факт, что ты не участвуешь, а просто смотришь или даже проходишь мимо, тебя не спасет. Хотя про 2 апреля — вообще разговор особый.

С самого начала своего президентства Лукашенко изо всех сил стал делать нашу жизнь если не лучше, то уж во всяком случае веселее. Манерой поведения, формой и содержанием речей, селекторными совещаниями на всю страну и т.п. Лукашенко давно заслужил звание самого забавного президента в Европе (не говорю — в мире, так как его эквадорский собрат, недавно отстраненный от должности президента по причине психической невменяемости, является серьезным соперником за пальму первенства).

(Продолжение на стр. 4)

© PDF: Kamunikat.org 2010 © Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2010

Радкі з лістоў

Паважаная СВАБОДА! Хачу паведаміць вам навіну пра тое, як сустракалі прэзідэнта Лукашэнку ў нашым горадзе Нясвіжы. У ноч перад ягоным прыездам (18 красавіка) нехта размаляваў бетонныя платы і сцены «прывітальнымі» надпісамі: *«Лука — здраднік», «Лука — Іуда», «Луку — на муку»* і іншымі падобнымі. Але пільная міліцыя яшчэ да ўзыходу сонца выявіла непарадак і да пачатку працоўнага дня ўсе «крамольныя» надпісы былі зафарбаваныя — Нясвіж сустрэў прэзідэнта рознакаляровымі платамі і сценамі.

Лявон Н., *г.Нясвіж*

Глядзеў хакейны матч Беларусь — Аўстрыя. Каменціруе Навіцкі: *«На трыбунах размахваюць нацыянальнымі сцягамі Беларусі»*. Чаму рэжысёр гэта не паказвае? А рэжысёр усё-такі паказаў, праўда, усяго толькі аднаго чалавека — але ж з бел-чырвона-белым сцягам. Тут на нейкі час каментатар разгубіўся, і я яго разумею.

Э.ЮР'ЕЎ

В телефонном справочнике Национального и коммерческих банков Беларуси почти нет еврейских фамилий. В успех этих банков трудно поверить.

Семен КОНСТАНТИНОВ, *г.Минск*

Хто яшчэ трапіць у беларускую пастку?

Тэлебачанне — магутная зброя. Асабліва калі яно манапольнае і надзейна кантралюецца дзяржавай. Беларускія электронныя мас-медыя цалкам пад абцасам Лукашэнкі. Але не трэба ствараць ілюзіяў, нібыта расійскія тэлевізійныя каналы вольныя і незалежныя.

Чаму расійскія сродкі масавай інфармацыі (усе каналы тэлебачання) актыўна асвятляюць антыдэмакратычныя дзеянні рэжыму ў Беларусі? Як падказвае логіка, калі Расія гэтак старанна імкнецца прырэзаць апетытны беларускі кавалак, дык на самой справе яна мусіць дзейнічаць наадварот — хаваць праўду пра падзеі на мінскіх вуліцах. А калі раптам дапусціць, што ўсё гэта патрэбна, каб адлучыць Рыгоравіча ад улады, дык у Масквы ўжо было на тое безліч рэальных мажлівасцяў.

Мая нядаўняя паездка па Расіі дала багата фактаў для роздуму. Па-першае, міф пра тое, што Лукашэнка страшэнна папулярны ў Расіі, мякка кажучы, не адпавядае сапраўднасці. Па-другое, расійскі народ пачынае ацэньваць сваіх палітыкаў па іх адносінах да Лукашэнкі. Лукашэнка стаў пасткай для чырвона-карычневых, і самым вялікі «звер», які ў яе трапіў, — Зюганаў. Успомніце, як часта пасля прагона беларускага відэароліка ён з'яўляецца ў тэлевізійным расійскім акенцы і знаходзіць усё новыя і новыя словы аб тым, які добры Лукашэнка, што расійскія камуністы горача падтрымліваюць беларускага прэзідэнта (прадаўшы беларускіх аднапартыйцаў). Але убачыўшы на свае вочы, як беларускую дзяўчыну лупцуюць гумовымі палкамі тры здаравякі ў камуфляжы і як народнага выбранніка, збітага на горкі яблык, цягаюць за ногі па асфальце, дык наўрад ці дасі веры, што гэта той шлях, які трэба. Расійскі народ цяпер ужо не прагаласуе за таго палітыка, які ў тэлевізійную камеру хваліў Лукашэнку і ягоныя парадкі.

Выказванні палітыкаў на фоне мінскіх відэасюжэтаў могуць стаць галоўным аргументам на чарговых (ці пазачарговых) прэзідэнцкіх выбарах у Расіі.

Барыс Ельцын ужо, відаць, не гулец. Можна не ставіць і на Чарнамырдзіна, ён, па ўсім відаць, асабіста не прэтэндуе на маскоўскі трон. Застаўся «чыстым» Лебедзь, які, нягледзячы на нядаўнія пацалкункі з Лукашэнкам, катэгарычна выказаўся супраць апошніх рэдакцыяў дакументаў аб расійска-беларускім саюзе і спыніў хваласпевы ў гонар беларускага інтэгратара. Інтуітыўна адчуў пастку? Але ж ці не сам Лебедзь уводзіў у вушы «каранаванаму» старшыні саўгаса, што трэба жорстка падаўляць любыя праявы супраціву?

Беларуская карта, відавочна, краплёная. Узяць на свой «баланс» Беларусь Расія не можа — няма сродкаў. Выпусціць са сваіх «братэрскіх» абдымкаў таксама — нельга, бо гэта адзіны (апошні) легальны кардон на Захадзе. Трэба трымаць суседку ў сваёй арбіце, прывязваць эканамічна, ідэалагічна, «крыміналагічна». А гэта значыць — гуляць у блытаныя гульні, «выціскаць» усё мажлівае з інтэграцыйнага сюжэту і скарыстоўваць міфы ў сваіх інтарэсах.

Спектакль, які пачаўся як фарс, відавочна, скончыцца на трагічнай ноце. Палітыка Лукашэнкі нарадзіла беларускі радыкалізм. Пачаўся глыбінны працэс, які ўжо не кантралюецца лідэрамі БНФ. А гэта значыць, што яго нельга адсочваць і спецорганам. БНФ — адкрытая арганізацыя, а стыхійны супраціў — падпольны рух. Напрыклад, наваполацкім бэнэфаўцам перыядычна тэлефануюць з «камітэта» і просяць перастаць размалёўваць горад антыпрэзідэнцкімі лозунгамі. Аднак уся рэч у тым, што гэта робяць не сябры Фронта, а хтосьці іншы — ноччу, таемна. Бэнэфаўцы адкрыта выходзяць у пікеты, папярэдне падаўшы заяўку ў гарвыканкам.

Аўтары беларуска-расійскага спектакля загадзя не пралічылі ўсе варыянты. У Расіі, трэба зазначыць, ніколі не ўмелі добра лічыць — Чачня таму апошні прыклад. Лукашэнка ж пачаў гульню на боты суседа па камеры. Ці настолькі ён «пахан», каб выйграць?

Алесь АРКУШ, *г. Наваполацк*

Чаму не працуюць кіёскі Таварыства беларускай мовы

Дарагія суайчыннікі!

Ужо 7 месяцаў, як не працуюць шапікі Таварыства беларускай мовы імя Францішка Скарыны, што знаходзяцца на вул.Леніна і вул.Танкавай у Мінску. Гэта былі месцы, дзе вы маглі набыць нашую добрую кнігу, касеты з запісамі нашых выканаўцаў, вырабы народнага мастацтва і інш.

Для аднаўлення працы патрэбныя сродкі на набыццё новага металічнага кіёска і двух касавых апаратаў.

Дапамагчы ў гэтай сітуацыі можаце толькі Вы! Вашыя ахвяраванні просім перасылаць на рахунак *3015212330014, код 764 у Гардырэкцыі Белбізнесбанка г.Мінска.* Упэўненыя, што разам мы адолеем часовыя цяжкасці сённяшніх дзён і паспрыяем Адраджэнню.

Сакратарыят Таварыства беларускай мовы імя Ф.Скарыны

ДВА ПИСЬМА НА ОДНУ ТЕМУ

Для государства мы не существуем

Здравствуйте, уважаемая редакция!

Я прочитала в номере за 19 марта статью Кати Мильке *«Осталось впечатление, что в Новинках многое скрывают»*, которая меня очень взволновала. О «психушке» знаю не по наслышке, так как мой единственный ребенок, одиннадцатилетний Виталик, страдает страшным психическим заболеванием — детской шизофренией, причем в самой ее тяжелой форме. Я воспитываю своего сына-инвалида одна. Его отец (мой бывший муж) давно от нас ушел. Пенсию по уходу за ребенком-инвалидом получаю чисто символическую — 315 тыс. рублей.

Моя жизнь — это ежедневный ад: с одной стороны — невыносимый быт, с другой — тяжелая моральная обстановка.

Мой Виталик лечился несколько месяцев в детском отделении психиатрической больницы в Новинках. Почти ежедневно навещая его, я многое узнала о царящих там нравах и порядках. Дети-инвалиды у нас самые беззащитные, самые бесправные члены нашего общества.

За 11 лет мой ребенок ни разу не получил ни социальной, ни материальной помощи (кроме вышеозначенного пособия, на которое можно прокормить разве что собаку). Сердце разрывается от жалости к моему бедному сыночку. Ведь он лишен самых простых и таких необходимых для ребенка радостей: общения со сверстниками, прогулок на природе. На нищенскую пенсию я не могу купить ему ни игрушек, ни книжек, ни одежды, ни нормальной еды.

Никогда дверь нашей квартиры не открывал ни один учитель из ближайшей школы. Я сама с трудом научила моего Виталика читать и писать. То есть, мы с сыном для государства как бы не существуем. Живем в полной изоляции от мира, оставленные один на один со своей бедой. Мы как два узника, заключенные в квартире. Если бы вы видели, как невыносимо тяжело приходится бороться, когда у него начинаются припадки...

Мы обречены на мучительное умирание. Все это порождает у меня чувство безысходности и обреченности. Как я могу, полуголодная, обессилевшая, без работы, без денег, без ничего — противостоять жестоким обстоятельствам, в которых оказалась вместе с ребенком? Я не знаю...

Неоднократно я обращалась за помощью в различные организации: в Красный Крест, Ассоциацию родителей детей-инвалидов, в отдел социальной защиты населения и т.д. Везде отвечают: «Помочь ничем не можем. Это ваши проблемы». Зато не раз мне приходилось выслушивать суждения, что психически больные люди — это отбросы общества, которых нужно уничтожать. Одна санитарка в больнице искренне возмущалась, почему таких больных не усыпляют, чтобы они сами не мучились и других не мучили. Вот так. Можно представить, как такой медработник ухаживает за этими несчастными людьми.

Я мучительно ищу выход, чтобы спасти моего ребенка. Я не знаю, как мне жить дальше. Сдать сына в интернат для психохроников, чтобы самой найти работу? Но мой ребенок такой ослабленный, он быстро там погибнет. В больнице он все время был привязан за руки и за ноги к металлической кроватке, лежал весь мокрый. Когда забирала его домой, он даже не мог идти, несла на руках. Боюсь, что в интернате ему будет еще хуже. Что же мне делать? Долгие годы я героически пыталась сопротивляться своей беде. Я полностью отказалась от личной жизни, посвящая все время больному ребенку, от которого нельзя отойти буквально ни на минуту. Я уже забыла, что такое кино, театр, друзья, отдых. Это не жизнь, а животное существование.

Тамара ДУНАЙ, *г.Минск*

Наши дети – отверженные

Здравствуйте, уважаемая редакция!

У нас в семье — горе. Моя дочь Ирина — инвалид с детства: парализованы правая рука и нога. Но, к счастью, она ходит, учится в общеобразовательной школе.

Мы с мужем не отдали нашу дочь в интернат для инвалидов, хотя мне и приходилось слышать советы сделать это. Нам даже советовали отказаться от больного ребенка. Сейчас нашей дочери уже 10 лет, она учится в четвертом классе и усваивает программу, хотя пишет пока медленно. Ради нее я сама начала изучать английский язык, научила ее писать английские слова и предложения. И ей очень нравится читать английские сказки — пока что простые и короткие тексты.

Ребенку-инвалиду очень трудно жить. У нашей дочери нет друзей. И самые счастливые для нее дни, когда с ней гуляют другие дети. Она долго об этом вспоминает потом. Многие не понимают нас, стараются даже унизить и оскорбить. По существу, и мы, и наши дети — отверженные. Семья, в которой воспитывается ребенок-инвалид, в нашем обществе почему-то вызывает только презрение и насмешки.

Но я уже научилась не обращать на это внимания и идти своей дорогой. Бог открыл мне через мою дочь глаза на многое, чего я раньше не понимала и что должна была понять.

Оксана СУЛКОВСКАЯ, *г.Житковичи, Гомельская обл.*

БЕЛОРУССКИЙ ФОНД СОРОСА
МОЛОДЕЖНАЯ ПРОГРАММА
объявляет конкурс исполнителей альтернативной музыки

К участию в конкурсе приглашаются **молодые исполнители**, работающие в жанре **нетрадиционной музыки** и активно разрабатывающие **новые направления** в **белорусской музыкальной культуре.**

Для участия в конкурсе исполнителям необходимо представить:

Заявку на участие с указанием названия группы и краткой информацией о ней, данными об участниках группы /ФИО, паспортные данные, контактный телефон/. **Демонстрационную запись** /не менее 15 минут/ на аудио- или видеокассете. Допускается нестудийное качество.

Последний срок подачи заявок 1 июля 1997 года

По результатам предварительного отбора будет составлена программа **Второго фестиваля альтернативной музыки**, который состоится в сентябре 1997 года. ***Лучшие из участников*** фестивальных концертов получат ***возможность записи и тиража*** авторской программы,а также ***возможность участия в музыкальных теле- и радиопрограммах.*** Лауреаты предыдущего конкурса допускаются к участию на общих основаниях.

ВНИМАНИЕ !
НА КОНКУРС НЕ ПРИНИМАЮТСЯ ЗАЯВКИ ОТ ПРОФЕССИОНАЛЬНЫХ И ФИЛАРМОНИЧЕСКИХ КОЛЛЕКТИВОВ

Заявки на конкурс принимаются по адресу:
220027 г.Минск, пр.Ф.Скорины, 65, корпус 11А, к.107,
Белорусский Фонд Сороса.
Телефоны для справок:
/017/ 232 25 26, 232 70 64, 232 77 13, 232 80 92

© PDF: Kamunikat.org 2010 © Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2010

Катастрофа на ЧАЭС была запланирована. Планировщики вновь за работой

Константин СКУРАТОВИЧ

Анализируя обстоятельства катастрофы на ЧАЭС, приходишь к выводу о ее фатальной предопределенности. За всеми решениями, связавшимися в трагическую цепь, стояли люди принудительно организованной социально-экономической и политической системы.

В самом начале, когда еще ничего не было, была государственная тайна. О ней политическому руководству страны в секретной записке, датированной 21 февраля 1979 года, доложил председатель КГБ Юрий Андропов: *«По имеющимся в КГБ СССР данным, на отдельных участках строительства второго блока Чернобыльской атомной электростанции имеют место факты отступления от проектов, а также нарушения технологии ведения строительных и монтажных работ, что может привести к авариям и несчастным случаям... По существу указанных нарушений КГБ Украины проинформировал ЦК КПУ».*

Впоследствии оказалось, что *«уровень технологической дисциплины на ЧАЭС не соответствовал предъявляемым требованиям. Имели место систематические нарушения технологического регламента, часто блоки останавливались по вине обслуживающего персонала. Причины нарушений не всегда выявлялись, а в отдельных случаях истинные причины нарушений скрывались... За период 1980—1986 годов в 27 случаях из 71 расследования вообще не проводились, а многие факты отказа в работе оборудования даже не регистрировались в журнале учета».*

Как известно, директора ЧАЭС Брюханова за допущение аварии, приведшей к катастрофическим последствиям, приговорили к десяти годам лишения свободы. Брюханову, в частности, вменялось в вину то, *«что 31 декабря 1983 года он подписал акт о приемке в эксплуатацию пускового блока как полностью законченного, хотя на четвертом энергоблоке не были проведены необходимые испытания».*

Почему акт о приемке был подписан в последний день года — вопрос риторический. Его величество план определял логику поведения советского человека на производстве.

Атмосфера круговой поруки, боязнь руководителей принимать решения, которые могли подпортить послужной список, были едва ли не главными мотивами их на деле безответственного поведения в условиях господства «планового» хозяйствования.

Примечательно, что должностное преступление совершено директором ЧАЭС в 1983 году, когда на укрепление производственной дисциплины лучшие силы бросил КГБ. Одновременно Ю.Андропов запретил традиционные для времен застоя корректировки планов и потребовал всемерного ужесточения плановой дисциплины. Так что одной из глубинных причин катастрофы, помимо характерного для советского работника разгильдяйства, стало и рефлекторное его стремление угадывать волю начальства, «дать план любой ценой».

Однако такое поведение было характерным и для самого руководства. В Припяти, где радиационная обстановка была ясна сразу же после аварии, никто из местных руководителей, обязанных по всем инструкциям и приказам принимать решения о выводе населения, никто ответственности на себя не взял. Вряд ли у кого теперь возникают сомнения в том, что такое поведение не было запланированным.

По прошествии 11 лет после катастрофы несколько притупилась боль и забылись слезы. Но каждый может, вспомнив своих знакомых, убедиться, что Чернобыль до сих пор с нами. Главное — неизвестно от чего умирают дети. Буквально сгорают за месяц-два, хотя врачи до последнего часа успокаивают родителей. Нам больше уже никто не говорит, каким образом на загрязненых территориях колхозы выращивают экологически чистые продукты. Да и что говорить народу, если он вынужден выбирать между гипотетической смертью от радионуклидов и вполне реальной смертью от голода.

Можно было бы сослаться на цифры, которые вполне красноречиво свидетельствует о вымирании нации. Однако больше всего удручает политика властей, которые упорно отстаивают систему, превратившую нас в заложников катастроф. С газетных страниц, с телеэкранов нам постоянно твердят о необходимости восстановления «планового начала» в экономике, о недопущении рынка в святая святых социализма, в колхозы и на госпредприятия-гиганты.

Между тем попытка их реанимации смерти подобна. «Священные коровы» рыночного социализма отличаются редкостной прожорливостью. Они ведут себя по всем правилам «затратной экономики» и требуют все больше и больше ресурсов. А между тем будущее страны связано с энергосбережением и развитием альтернативной энергетики.

На Западе, где экономический рост имеет органическую природу, увеличение объемов производства не имеет фатальных последствий для окружающей среды. Например, при общем росте автомобильного парка (хотя автомобилизация уже достигла всех мыслимых пределов) с каждым годом снижается выброс вредных веществ в атмосферу и остается стабильным потребление бензина. Отапливаемая российским газом (экологически чистое топливо!), который транспортируется по нашей территории, Европа равнодушно наблюдает, как белорусская деревня рубит дрова в отравленных радионуклидами лесах, заготавливает брикеты на зараженных торфяниках и использует золу для выращивания чудо-помидоров на «сотках». Это вопиющее несоответствие между энергопотреблением в промышленности и способами получения тепла в быту отмечают все зарубежные наблюдатели.

А тем временем чиновники, которым не дает покоя вынужденный отказ от завершения строительства Минской АТЭЦ, уже ищут участок для посадки АЭС. В качестве возможных рассматриваются Могилевская и Витебская области. Понятно, что унаследованный от прежних времен глобализм руководства страны требует своего выхода. Но почему именно АЭС?

Если, как утверждают, катастрофа на ЧАЭС произошла благодаря невероятному стечению обстоятельств, а атомная энергетика в принципе совершенно безопасна, то почему все-таки отказались запускать атомную станцию под боком у столицы? Или опасность вполне реальна, но Могилев и Витебск «не так жалко»?

Как считают специалисты, топливно-энергетический комплекс Беларуси дает» 55—60% загрязнения окружающей среды. По статистике в 1992 году на наши головы «вывалилось» 2 млн. 704 тыс. т различных вредных веществ. Выбросы от стационарных источников (ГРЭС, ТЭЦ, котельные и т. д.) составляли 889 тыс. т, через два года — 580 тыс. т. Уменьшение объемов вредных выбросов объясняется сокращением промышленного производства и потребления энергии: с 49,2 млрд. кВт/ч в 1990 году до 23,5 млрд. кВт/ч в 1996 году.

Как считают в Минтопэнерго и Госкомитете по энергосбережению, на белорусских станциях можно производить не менее 44 млрд. кВт/ч. Иными словами, тепловая энергетика из недостаточной стала избыточной, но за рубежом (Игналинская и Смоленская АЭС) в прошлом году было закуплено 8,6 млрд. кВт/ч по ценам более низким, чем предлагают белорусские станции.

Вообще, экономия — вещь хорошая, но в некоторых случаях недопустима и приносит выгоды иллюзорные при вполне реальном ущербе для окружающей среды и здоровья людей. Так, через два года войдет в действие первый блок тепловой станции на месте бывшей Минской АТЭЦ. Но, как было отмечено на февральском семинаре «Природные ресурсы, возобновляемые источники энергии, окружающая среда», в этом проекте вообще не предусмотрены системы очистки. Резон — очистительные установки вызывают удорожание электроэнергии на 30%. Воистину, не ведают, что творят!

Если же говорить о планетарном значении Чернобыля, то оно не исчерпывается проблемой ликвидации последствий катастрофы. Чернобыль со всей остротой поставил вопрос о выживаемости человечества в условиях применения новых технологий, способных оказывать глобальное разрушительное воздействие на среду обитания и на самого человека. Проблема Чернобыля в большей степени принадлежит всему миру и будущему, хотя она и поставлена режимом, который не хотел «ждать милостей от природы». Режимом, который реанимируется в Беларуси.

Холодная весна девяносто седьмого

(Начало на стр. 2)

Видимо, именно в развитие похвального стремления повеселить своих сограждан белорусский диктатор подписал декрет, которым практически вдвое продлил День смеха (и День дураков, кстати). 2 апреля объявлено государственным праздником — Днем единения народов Беларуси и России. Чтобы было еще смешнее, этот государственный праздник остался рабочим днем.

Отправившись в этот день на митинг, я обратил внимание на милиционера, который, вдали от политических бурь, улыбаясь, отламывал большие куски от батона, старательно крошил их и кормил голубей. Увы, эта идиллическая картинка резко контрастировала с тем кошмаром, что чуть позже учинили сослуживцы этого любителя пернатых. Равно как и встреченное аплодисментами митингующих сообщение о том, что в последнее время в знак протеста по поводу действий режима из милиции уволилось 17 сотрудников. Дальнейшие события показали, что милиционеров, готовых служить режиму, как цепные псы, значительно больше.

Когда, как и было запланировано, после митинга к российскому посольству направилось шествие, которое вдохновенно скандировало *«Радзіма! Свабода! Далоў Луку-урода!»* — людей никто не трогал. Когда шествие остановилось перед трехслойным кордоном милиционеров, сзади которых, чтобы им было некуда отступать, вплотную поставили милицейские машины (а чуть подальше за ними виднелся еще один такой же кордон) — противостояния тоже никто не нарушал. Милиция только постоянно выражала *«убедительную просьбу покинуть проезжую часть и разойтись по домам»*. И только после того, как «убедительная просьба» была выполнена и люди начали расходиться, из автобусов выскочили спецназовцы и вместе с милиционерами пошли в атаку.

Отлов людей после того, как общественное выступление уже закончилось — вообще действие подлое. По сути, это то же самое, что нож в спину. Подобное, однако, стало в Минске делом привычным — скорее было бы удивительно, если бы этого не произошло. Но то, что делалось 2 апреля, резко отличалось от обыкновенного «хапуна», так как было беспрецедентным по жестокости. Телевизионные кадры не давали об этом полного представления, поскольку не могли отразить массовости и масштабности избиения. Людей без устали молотили дубинками, не разбирая возраста и пола (хотя особое внимание обращали на молодежь), и не только на улице, но и в прилегающих дворах; последнее называлось «зачисткой дворовых территорий».

Слово «зачистка» — это из лексикона российских войск, воевавших в Чечне. Там оно означало аналогичную методику — только с той существенной разницей, что вместо дубинок использовались АКМ. Женщин волокли в «воронки» за волосы. Зачастую людей избивали уже не в момент задержания, а чуть позже, держа за руки — да так старательно, что обломки резиновых дубинок валялись на улице. Что уж говорить о том, что ни на депутатский иммунитет, ни на журналистскую аккредитацию не обращали внимания. Причем совершенно цинично: например, корреспонденту «Белорусского рынка» В.Александровичу ударом дубинки повредили кисть руки как раз в тот момент, когда он показывал этой рукою журналистское удостоверение.

Учитывая, что хватали и избивали не только участников, а всех, кто попадал под руку, можно сказать, что режим перешел к тактике тотального устрашения. **Людям хотят внушить страх — фундамент, на котором держится любая диктатура**. Надо сказать, что это не очень получилось — люди чувствовали не страх, а ненависть, и от разных, не знакомых между собой людей приходилось слышать одну и ту же фразу: «Дали бы нам автоматы...» А еще — было очень противно. Ощущение — как в знаменитой книге Вен.Ерофеева: «Стошнить-то — уже ни за что не стошнит, а вот сблевать — сблюю».

Желающих ходить с таким букетом немного.

Многие из жителей домов, рядом с которыми происходило побоище, выражали сочувствие демонстрантам. Некоторые даже называли свои адреса и предлагали прятаться у них от дубинок и арестов. Медик, который шел домой, пригласил журналиста В.Александровича зайти к нему, чтобы оказать помощь. Я сам видел, как пожилая женщина выбежала из двора и бросилась к милиционерам с вопросом: *«Это же наши дети — зачем вы их бьете?»* Ответ был стандартным: удар дубинкой и затягивание в машину. По иронии судьбы, на этой машине каким-то чудом уцелел герб «Пагоня». Думается, что после таких событий количество пассивных противников диктатуры несколько возросло.

Что же касается активных, то сравнение численности оппозиционного митинга с митингом лукашистов, проходившим в этот же день в парке Горького, явно не в пользу режима. На сей раз на митинг в поддержку политики Лукашенко никого не сгоняли, и поэтому кучка людей с красными флагами и портретами диктатора довольно сиротливо смотрелась даже на небольшой площадке — несчастные несколько сотен — да и то в основном ветераны, люди не просто пожилого возраста, а совсем старики. Это вселяет надежду, что у режима нет будущего.

Как бы там ни было, то, что «день братского единства славянских народов», официальный праздник режима, Лукашенко ознаменовал массовым и жесточайшим избиением людей — факт глубоко символичный.

Назавтра был запущен судебный конвейер — разумеется, с вопиющими нарушениями законодательства. Так, в суде Партизанского района судья Н.Ройник категорически отказалась проводить открытые заседания; наблюдатели из Белорусского Хельсинкского комитета обратились к председателю суда Э.Кузьменковой, в результате чего та велела всем судьям проводить по фактам участия в шествии только закрытые заседания, причем отказала в праве присутствовать на заседаниях в грубой форме и без всякой мотивировки. Задержанные милицией случайные прохожие, которые в суде выразили естественное возмущение тем, что их схватили, в итоге получили более суровые приговоры, чем участники акции.

В метеорологическом плане нынешняя весна выдалась довольно прохладной. Некоторые сторонники оппозиции, ожидавшие от «минской весны» чуть ли не немедленного падения режима, считают ее таковой и в политическом плане. Но главный, на мой взгляд, итог прошедших событий — это то, что ситуация не законсервировалась, что сопротивление диктатуре идет постоянно. Другое дело, что, пока весна еще не кончилась, из событий следовало бы извлечь несколько уроков. Но об этом — в следующий раз.

© PDF: Kamunikat.org 2010 © Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2010

Бельгія перад пагрозай расколу

Нешта не так у Бельгійскім каралеўстве. Гэтая невялікая (у параўнанні з суседзямі — Германіяй і Францыяй) краіна з 10-мільённым насельніцтвам сутыкнулася з перспектывай расколу на дзве часткі — фламандскамоўную Фландрыю на поўначы і франкамоўную Валонію.

Камень сутыкнення ляжыць не столькі ў полі лінгвістычным, колькі ў эканамічным. Фландрыя больш заможная за Валонію, і яна не хоча дзяліцца сваім дабром.

Сёння фламандцы на ўвесь голас гавораць тое, аб чым раней толькі зрэдку думалі: калі цяперашняя сістэма федэральнага кіравання застанецца нязменнай, яны могуць апынуцца ў такім жа складаным эканамічным становішчы, што і поўдзень.

Напрыклад, узровень беспрацоўя ў Валоніі ўжо перавысіў 15%, а ў Фландрыі ён меншы за 5%. У 1996 годзе фламандцы стварылі 40.000 новых працоўных месцаў. Паказчык гэтага года ўжо дасягнуў адзнакі 20.000 вакансіяў. Доля поўначы ў валавым ўнутраным прадукце Бельгіі складае 2/3. Гэтага поспеху Фландрыя дасягнула дзякуючы рэструктурызацыі вытворчасці і ўвядзенню новых тэхналогіяў.

Што ж да Валоніі, то, акрамя эканамічнага бязладдзя, яе ўвесь час калоціць ад скандалаў, звязаных з забойствамі дзяцей і карупцыяй у чыноўніцкіх колах Сацыялістычнай партыі. На працягу многіх гадоў сацыялісты кіравалі эканамічным і палітычным жыццём Бельгіі. Іхняя палітыка, у многім заснаваная на догмах К.Маркса, прывяла рэгіён да крызісу.

Працэс «дээінтэграцыі» вызначыўся яшчэ пасля Другой сусветнай вайны. У 1992 годзе кааліцыйны ўрад сацыял-хрысціянскай партыі і сацыялістычнай партыі падпісаў дакумент, вядомы пад назвай «Сан Мішэль», які перадаваў частку паўнамоцтваў у сферы адукацыі, культуры, а таксама некаторых палітычных і эканамічных пытанняў лінгвістычным — фламандцам, валонцам, немцам — і рэгіянальным супольнасцям. На федэральным узроўні засталося вырашэнне праблем у галіне аховы здароўя і сацыяльнай абароны. Апошняе і не задавальняе фламандцаў — яны патрабуюць, каб сістэма сацыяльнай абароны насельніцтва таксама была падзелена між рэгіёнамі.

«Бельгійскай эканоміі не існуе!» — у адзін голас заяўляюць міністр-прэзідэнт Фландрыі Люк ван ден Бранд і міністр эканомікі Эрык ван Рампуб. — *Валонцы мусяць выбіраць: або фламандскае кіраўніцтва, або эканамічны крызіс».*

Цяжка прагназаваць, чым скончыцца гэты канфлікт. Кароль Бельгіі ніяк не рэагуе на яго, пазбягае выказванняў і каментараў. І гэта натуральна — ён манарх усёй дзяржавы. Зрэшты, Яго Вялікасць — не фламандзец і не валонец, ягоныя продкі — са старажытнага германскага роду.

Дзмітрый ДАРОХІН

Свет учора і сёння

Францыя

ПРЭЗІДЭНТ Ж.ШЫРАК распусціў Нацыянальны сход (парламент) і прызначыў датэрміновыя парламенцкія выбары на 25 траўня гэтага года. Другі тур мусіць адбыцца 1 чэрвеня. Шырак лічыць, што сёння паўстаюць праблемы, звязаныя з новай Еўропай, а парламент у цяперашнім складзе не ў стане іх вырашыць.

Апазіцыя асуджае прэзідэнта. Лідэр сацыялістаў Шаспэн сказаў, што новая Еўропа не павінна будавацца за кошт Францыі. Ён папярэдзіў, што ў выпадку прыходу сацыялістаў да ўлады яны перагледзяць прынцыпы ўступлення Францыі ў Еўрапейскі грашовы саюз. На Дублінскім саміце напрыканцы 1996 года Шырак заявіў, што калі Францыя не выканае ўсе патрабаванні для ўвядзення еўра — новай еўрапейскай валюты, то 1 студзеня 1996 года ён падасць у адстаўку.

Чэхія

ПРЭМ'ЕР-МІНІСТР РАСІІ ЧАРНАМЫРДЗІН сустрэўся з галавой чэшскага ўрада Клаўсам. Яны абмяркоўвалі ўступанне Чэхіі ў *NATO*, а таксама шэраг эканамічных пытанняў, у прыватнасці пастаўкі расійскай нафты. Чэхія падпісала дамову з Нарвегіяй на пастаўку нафты з поўначы, каб аслабіць залежнасць ад Расіі. Чарнамырдзін запэўніў, што палітычныя пытанні не паўплываюць на эканамічныя дамовы. Ён таксама дадаў, што нават пасля падпісання пагаднення паміж *NATO* і Масквой у Парыжы 27 траўня Расія будзе негатыўна ставіцца да пашырэння Паўночна-атлантычнага альянсу на Усход.

Чачня

ФАРМІРАВАННЕ ПРАФЕСІЙНАГА ВОЙСКА пачаў урад Чачэнскай Рэспублікі. Створаны першы батальён, які налічвае 1.500 салдатаў. Масква неадназначна заяўляла, што Чачня з'яўляецца суб'ектам Расійскай Федэрацыі, а таму не мае права мець уласную армію.

Лондан

У ПАНЯДЗЕЛАК БЫЎ ПАРАЛІЗАВАНЫ увесь транспарт з-за пагрозы Ірландскай рэспубліканскай арміі *(IRA)* правесці тэракты. Не працавалі лонданскія вакзалы, а на дарогах утварыліся вялікія заторы. Сваімі пагрозамі *IRA* хоча паўплываць на выніку парламенцкіх выбараў, якія адбудуцца 1 траўня.

Іран

У ПЕРСІДСКІМ ЗАЛІВЕ распачаліся ваенныя вучэнні іранскай арміі пад назвай «Дарога да Іерусаліма». У іх удзельнічае 200.000 салдат. Іран мае адну з самых буйных армій у свеце — каля 600.000 чалавек.

Перу

СПЕЦЫЯЛЬНЫЯ ПАДРАЗДЗЯЛЕННІ штурмам узялі японскую амбасаду ў сталіцы Перу Ліме, дзе баевікі з марксісцкай тэрарыстычнай арганізацыі Тупак Амару на працягу 4 месяцаў утрымлівалі больш за 70 заложнікаў. Тэрарысты патрабавалі, каб з турмаў былі выпушчаныя 400 членаў гэтай арганізацыі. У выніку аперацыі 71 чалавек вызвалены, 1 заложнік — член Вярхоўнага Суда Перу — памёр ад сардэчнага прыступу. Усе 14 тэрарыстаў забітыя.

Тэрарысты з групоўкі Тупак Амару не паказвалі свае аблічча.

Алжыр

У ВЫНІКУ САМАГА КРЫВАВАГА тэракту мусульманскіх фундаменталістаў загінулі 93 жыхары вёскі, што ў 25 км ад сталіцы. Сярод ахвяраў — жанчыны і дзеці. Ёсць версія, што жыхары адмовіліся супрацоўнічаць з фундаменталістамі. Усяго за 5 год вайны ў Алжыры загінула 60.000 чалавек.

Балгарыя

НА ДАТЭРМІНОВЫХ ПАРЛАМЕНЦКІХ ВЫБАРАХ перамог антыкамуністычны Саюз дэмакратычных сіл, які атрымаў 52% дэпутацкіх месцаў — 137 мандатаў з 240. Мяркуецца, што прэм'ер-міністрам стане лідэр Саюза Іван Костаў. Асноўныя пункты яго праграмы — барацьба з карупцыяй і арганізаванай злачыннасцю, а таксама шчыльнае супрацоўніцтва з міжнароднымі фінансавымі арганізацыямі. Першым крокам новага ўрада будзе лібералізацыя цэн на хлеб. Галоўнай апазіцыйнай сілай у парламенце будзе былая ўрадавая Сацыялістычная партыя, якая атрымала 57 месцаў (22%).

Сербія

АДЗІН З ЛІДЭРАЎ АПАЗІЦЫІ ВУК ДРАШКАВІЧ папярэдзіў прэзідэнта Мілошавіча, што калі не будуць праведзеныя рэформы, у тым ліку — лібералізацыя законаў аб прэсе і змяненне закона аб выбарах, то штодзённыя дэманстрацыі на вуліцах Бялграда распачнуцца зноў. Парламенцкія і прэзідэнцкія выбары прызначаны на канец гэтага года.

Нью-Йорк — Заір

Генеральны сакратар ААН Кофі Анан абвінавачаў паўстанцаў у Заіры у бесчалавечных адносінах да бежанцаў. Па звестках прадстаўнікоў гуманітарных арганізацыяў, паўстанцы перашкаджаюць дастаўляць мірныя грузы пацярпелым ад ваенных дзеянняў. У выніку наступлення паўстанцаў на Кіншасу каля 60.000 чалавек вымушаныя былі пакінуць свае дамы.

У пошуках новага горада

Эканамічны скачок азіяцкіх «тыграў» можа нечакана скончыцца ў клетцы ўшчэнт забруджаннага наваколля і энергетычнага крызісу, сцвярджаюць эксперты. Калі з гэтым не змагацца, эканоміка краін Усходнеазіяцкага рэгіёна можа сур'ёзна пахіснуцца ўжо ў 2000 годзе.

Пакуль міністры ў Малайзіі думаюць пра «разумны горад», босыя сяляне запрагаюць буйвалаў.

Малайзія падышла да праблемы прагматычна і вырашыла рэалізаваць ідэю «разумнага горада» XXI ст. Гэты праект, які называецца Шматінфармацыйны Суперкалідор *(Multimedia Super Corridor)*, быў прадстаўлены прэм'ер-міністрам Махацірам Махамадам. Новы горад плануюць пабудаваць на шырокай прасторы на поўдзень ад малазійскай сталіцы Куала-Лумпур. Шматінфармацыйны Суперкалідор падтрымліваюць такія магутныя кампаніі, як *NTT (Nippon Telegraph & Telephone)* і *Microsoft*. На тэрыторыі ў 7.000 га планецуца стварыць *«універсітэт шматканальнай інфармацыі»* і цэнтр даследаванняў і развіцця.

Гэта будзе не проста эканамічная зона, а месца для *«рэалізацыі ідэй азіяцкага ўрбаністычнага развіцця ў XXI ст.»*, — з гонарам гавораць распрацоўшчыкі праекта. Яго прынцып заключаецца ў ігнараванні ўсялякага *«спажывання, вытворчасці і канцэнтрацыі»*, — катэгорый, характэрных для ўсіх індустрыяльных краінаў. Энергія будзе паступаць у асноўным ад сонца. Транспарт будзе абмежаваны электрацягнікамі і трамваямі, а аўтамабілі на бензіне будуць у горадзе забароненыя.

Вышыня будынкаў — не больш за 5 паверхаў. Ніякага бетону. Ніякіх ліфтаў. Вентыляцыя — толькі натуральная. А пакольні гэта будзе «разумны горад», то ўсе будынкі будуць прыстасаваныя да новых кабельных і валаконных сістэм сувязі.

Калі гэтыя намаганні Малайзіі падхопяць іншыя краіны рэгіёна, XXI ст. павінна стаць эрай Азіі.

Nihon Keizai Shimbun (Японія)

Фабрыка прыгажосці

Конкурсы прыгажосці, якія ў іншых краінах ужо не ў модзе, у Венесуэле карыстаюцца велізарнай папулярнасцю

Прамая тэлетрансляцыя грандыёзнага шоў Міс Венесуэла, а потым і Міс Сусвету б'е ўсе рэкорды па колькасці тэлегледачоў — гэтыя перадачы глядзяць каля 90% дарослага насельніцтва Венесуэлы.

Пры выбары «самай-самай» улічваецца не толькі прыродная прыгажосць, але таксама і інтэлектуальныя здольнасці кандыдаткі. Таму Арганізацыя Міс Венесуэла (АМВ), якая займаецца «гадаваннем» прыгажунь, мэтанакіравана нагружае дзяўчат «агульнымі ведамі». Да гэтага часу арганізатары незадаволена крывяцца, калі ім нагадваюць, як Ганна Тэрэза Арапэза — Місс Венесуэла-92 — шчыра заявіла публіцы, што Ўільям Шэкспір — яе любімы кампазітар.

Напружаная праца венесуэльскіх міс-мэйкераў дае плён. У 1996 годзе ў чацвёрты раз тытул Міс Сусвету заваявала дзяўчына з Венесуэлы. Ёю стала 17-гадовая брунетка Аліцыя Махада. За гэта яна атрымала шыкоўны аўтамабіль плюс 3.000 доляраў. Але перад ёю была пастаўленая простая ўмова — захоўваць бездакорную форму (1,73 м — 51 кг), каб выконваць кантракты па рэкламе.

У канцы сакавіка дзверы АМВ адчыніліся для 28 кандыдатак на званне Міс Венесуэла-97. Адбіраць іх будзе ўладальнік і арганізатар конкурсаў, кубінец па паходжанні Асмель Суса. Менавіта ад яго залежыць рэалізацыя мараў дзяўчат стаць прафесійнымі манекеншчыцамі, спявачкамі ці актрысамі. Патрабаванні да іх наступныя: яны мусяць быць вясёлымі, узрост ад 17 да 24 гадоў, рост — не менш як 1,70 м. *«Рост — такая рэч, якую хірургічна змяніць нельга»*, — тлумачыць А.Суса. Прадпрыемства Суса трымае на сталай працы касметычнага хірурга і дантыста. Звычайныя задачы хірурга — зменшыць нос, зрабіць больш поўнымі вусны, прыпадняць павекі. Дантыст адказвае за непаўторную ўсмешку прыгажуні.

Каб прайсці падрыхтоўку ў Сусы, дзяўчаты павінны плаціць кожны месяц па 550 доляраў. Палаўцы ў АМВ, яны падпарадкоўваюцца ваеннай дысцыпліне з 8 гадзін раніцы да 10 гадзін вечара 7 дзён на тыдзень. Так яны жывуць з сакавіка па верасень, калі і адбываецца конкурс прыгажосці.

Сп.Суса «вырабляе» Міс Венесуэлу з 1979 года. 4 ягоныя выхаванкі былі абраныя Міс Сусвету, 5 — Міс планеты (так гучыць сусьшальны тытул для другога месца) і яшчэ некалькі — Міс Прыгажосць (трэцяе месца).

Courrier international (Францыя)

Талібан забараніў белыя панчохі і жаночыя лазні

У Афганістане больш за 2/3 тэрыторыі краіны кантралююць ісламскія фундаменталісты з руху Талібан.
Цяпер у афганскіх школах няма ні настаўніц, ні вучаніц. Талібан вырашыў, што школа — зусім не жаночае месца.

За выкананнем загадаў ісламістаў назірае рэлігійная паліцыя, якая патрулюе вуліцы і правярае кабет. Жанчынам забаронена насіць белыя панчохі, бо яны могуць прывабліваць мужчын. Вокны дамоў павінны быць зацемненыя, каб жанчыну нельга было ўбачыць з вуліцы. У дадатак жанчынам забаронена хадзіць у грамадскія лазні, якія для многіх былі адзіным месцам, дзе можна памыцца.

Талібан таксама забараніў папяровых змеяў — даволі папулярнае народнае мастацтва афганцаў, бо, як лічаць талібы, гэта можа перашкодзіць мужчынам маліцца пяць разоў на дзень. Паляровыя сумкі лічацца незаконнымі, бо яны (о жах!) могуць быць зробленыя са старонак Карана, якія пайшлі ў макулатуру. Футбол забаронены, гэта не ісламская гульня (бо іграюць бегаюць з голымі нагамі). Фатаграфія і відэа таксама лічацца «не ісламскімі».

Ніводная іншая ісламская краіна не мае такіх законаў. Нават у суседнім Іране, дзяржаве з жорсткім мусульманскім парадкам, жанчыны галасуюць і могуць абірацца ў парламент. У Афганістане ж роля жанчын зводзіцца да прыбірання ў хаце і прыгатавання ежы.

У выпадку, калі яны парушаюць законы Алаха, іх б'юць бізунамі і садзяць у вязніцу. Аб з'яўленні новых забаронаў жыхары даведваюцца па радыё Шарыят. Гэтыя «законы» выдумляюць мулы, у большасці непісьменныя выпускнікі медрэсэ (ісламскай школы), дзе іх толькі вучаць чытаць Каран на памяць.

Паводле інфармацыі Камісіі ААН па справах бежанцаў, з мінулага кастрычніка краіну пакінула каля 250.000 чалавек.

The Times (Англія)

Пяць разоў на дзень афганскія мужчыны моляцца ў мячэці, каб алах зрабіў іхніх жонак сціплымі і паслухмянымі.



Матэрыялы замежнай прэсы апрацаваў
Дзмітрый ДАРОХІН

© PDF: Kamunikat.org 2010 © Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2010

СВАБОДА
25 красавіка 1997 г., № 45

Толькі на «6-й лініі»

Падобна на тое, што мінская галерэя сучаснага мастацтва «6-я лінія» (вул. Якуба Коласа, 14) зноў хоча вызначыцца нечым асаблівым. На гэты раз тут вырашылі ўзрушыць сталічную багему і ўсіх цікаўных такім незвычайным відам мастацтва, як перфоманс.

Упершыню на Беларусі «6-я лінія» праводзіць Тыдзень перфоманса. Ён пачнецца ў панядзелак, 28 красавіка. Шчыра кажучы, я не вельмі добра ўяўляла сабе, што ж хаваецца за гэтым лаціна-франка-англійскім словам, і ў галерэі мне патлумачылі, што перфоманс мяркуе маленькі спектакль мастака, яго дзеянні «ў спецыяльна абсталяванай прасторы». Арганізатары сцвярджаюць, што на Беларусі раней такога ўвогуле не было, а між тым перфомансу як віду мастацтва ўжо амаль сто год!

У галерыі «6-я лінія» заўважылі, што перфоманс (ці, па-іншаму, *live-art*) узнікае, актывізуецца і часцей сустракаецца тады, калі адзін накірунак у творчасці мастака ўжо дастаткова распрацаваны, а новы яшчэ толькі нараджаецца. Пра *live-art* напісаныя тоўстыя кнігі, але вы іх можаце не чытаць — лепш убачыць усё на ўласныя вочы. На «6-й лініі» свой перфоманс вам прадэманструюць Максім Тымінько, Людміла Русава, Ілля Свірын (літаратурнае аб'яднанне «Бумбамліт») і іншыя зусім маладыя і крыху больш масцітыя мастакі.

Марына РАССАФОНАВА

Смешачкі ў начных клубах і расійскіх тэлестудыях

Каманда вясёлых і знаходлівых Беларускага дзяржаўнага універсітэта пасля правалу ў фінальнай гульні з «Махачкалінскімі бадзягамі» ўзяла своеасаблівы тайм-аўт.

Па версіі некаторых СМІ, беларускіх КВНшчыкаў праігнаравалі Аляксандр Маслякоў і Вышэйшая Ліга КВН, не запрасіўшы гуляць у гэтым сезоне. Аднак, наколькі нам вядома, гэта не адпавядае сапраўднасці. Такое запрашэнне было.

Проста беларускія жартаўнікі вырашылі крышку адпачыць, каб лепей падрыхтавацца да наступнага сезону. А пасля своеасаблівага рэкорду — каманда БДУ цвёрда трымалася ў Вышэйшай лізе 4 гады — гэта зусім не зашкодзіць. На адсутнасць аптымізму хлопцы не скардзяцца. Іх часта запрашаюць выступаць у лепшыя начныя клубы Мінска, у іншыя гарады Беларусі і за межы. Не так даўно маскоўская тэлекампанія *Video International* запрасіла капітана каманды Леаніда Купрыду на аўтарскую працу ў праграму расійскай тэлевізіі «Добрый вечер с Игорем Угольниковым». Прапанову папрацаваць над тэкстамі праграм «Доброе утро, страна», «Утренняя почта» атрымалі некаторыя іншыя члены каманды. Яны кажуць, што прыхільнікі літаральна закідалі іх лістамі. Можа, зноў жартуюць?

Наталля ПАШКАВЕЦ

Шчаслівы бомжык

Ларыса Грыбалёва, папулярная вядучая праграмаў Беларускага тэлебачання і ОРТ, называе сябе «чалавекам без пастаяннага месца жыхарства»

— Ларыса, кім ты сябе больш адчуваеш: тэлезоркай ці спявачкай?

— І тэлезоркай, і спявачкай адначасова. Можа, хто-небудзь падумае, што гэта дзяжурныя словы, але я жыву як кожны нармальны чалавек. І ў жыцці займаюся толькі тым, што мне падабаецца.

— Чаму менавіта ты стала весці «Усё нармальна, мама!» ?

— Гэта чыстая выпадковасць, як і ўсё астатняе ў маім жыцці. Я прымала ўдзел у конкурсе «Маладзечна-94», вядучым якога быў Ягор Хрусталёў. Ён там мяне і заўважыў. Потым Ягор падпісаў кантракт з маскоўскай фірмай АРС, і мы пачалі рабіць для іх «маму» на рускай мове. Калі АРС пачаў рыхтаваць і «Ранішнюю пошту», мяне запрасілі ў якасці вядучай. Гэта праўда, вы нічога такога не думайце! Усё зноў было чыста выпадкова.

— Дык што ў цябе цяпер займае больш часу — тэлевізія або кар'ера спявачкі?

— Можа, вы здзівіцеся, але я намнога больш часу аддаю канцэртнаму аркестру пад кіраўніцтвам маэстра Міхаіла Фінберга. Я прыехала ў Мінск як спявачка. Гэта мой асноўны занятак, менавіта ў аркестры ляжыць мая працоўная кніжка. А на тэлебачанні — я нідзе не ўваходжу ў штат супрацоўнікаў. Я — вольны мастак.

— Ларыса, прызнайся, ты ў жыцці такая ж крыўляка, як на экране?

— Ну вось — ізноў «крыўляка». І чаму ў мяне склаўся такі імідж?

На першай праграме «мамы» якую мне далі паперку з тэкстам, так і давялося сябе паводзіць. Не ведаю, чаму, але я пакуль не стала сур'ёзнай жанчынай. Не дарасла, мабыць. Але часам мне ўжо хочацца заняцца нейкай паважнай справай. Да опернай спявачкі я, канечне, не дацягну, мне ўвогуле больш падабаецца аперэтка — такі вясёленькі жанр. Думаю, што ўрэшце — хутчэй за ўсё, выпадкова — на мяне зваліцца штосьці новенькае, сур'ёзнае.

— Ларыса, а што такое «зорная хвароба»?

— Ага, я зразумела пытанне. У мяне заўсёды было шмат сяброў, я засталася ім вернай і да гэтай пары. Новых і выпадковых знаёмстваў, асабліва цяпер, я стараюся пазбягаць. Са мной нярэдка хочуць пазнаёміцца толькі таму, што я — Ларыса Грыбалёва. Бывае, праўда, знаёмлюся, але толькі з разумнымі і карыснымі (я маю на ўвазе — для творчасці) людзьмі. Блізка да сябе іх таксама не падпускаю! Затое чутак пра мяне... Вось адна з нядаўніх: гавораць, што я, маўляў, у «Ранішнюю пошту» трапіла таму, што пазнаёмілася з Мікалаем Фаменкам, сабралася за яго замуж і ўвогуле ў Маскву ад'язджаю. Бывае, падыходзяць на вуліцы зусім незнаёмыя людзі і гавораць: «Ларыса, самае галоўнае, каб ты не ад'ехала у Расію, не кідай нас!».

— Хвалююцца дарэмна?

— Я не маю ніякага фанатызму наконт таго, што толькі ў Расіі можна зрабіць кар'еру. Мне вельмі добра тут. Увогуле, мне больш падабаецца працаваць у Беларусі. Тут я адчуваю сябе вельмі камфортна. Раней я, як і многія, думала, што там (ах, там!..) людзі працуюць на больш высокім узроўні. Нельга сказаць, што я расчаравалася. Проста там усё па-іншаму: іншыя грошы, іншыя людзі. Трэба сказаць, што больш за ўсіх мне спадабаўся Юрый Нікалаеў: ён вельмі арганізаваны чалавек. Пастаянна мяне падганяе. У дзень мы здымалі па 4 перадачы! А гэта вельмі цяжка: пераапрананне, грым, дублі... Такая гонка! Я нават не ведаю, колькі перадач мы ўжо знялі. О! Мама мая ведае: яна ўсё піша на відэастужку.

— Мама?

— Так, яна працуе бухгалтарам на пошце ў Полацку. Бацька ў мяне вайсковец на пенсіі. Ведаеце, мне ў дзяцінстве ніколі не хацелася таго, чым я займаюся цяпер. У дзяцінстве чамусьці хацелася стаць касіркай у краме, потым сур'ёзнай (смяецца) журналісткай праграмы «Время», бегаць з тэлекамерай у трывожныя часы. Але так атрымалася, што я скончыла Віцебскі педагагічны інстытут па спецыяльнасці «настаўніца малодшых класаў», а потым паступіла ва Універсітэт культуры, дзе цяпер і вучуся на трэцім курсе. Ва універсітэце да мяне ставяцца з павагай, лічаць, што я знайшла сябе, але ніякіх паблажак не даюць. І я цяпер нават хаджу на заняткі.

— Ларыса, цікава, які ў цябе...

— ...Рост 153 сантыметры, памер нагі 35.

— У цябе ніколі не было комплексаў па гэтай прычыне?

— У дзяцінстве я нават плакала з крыўды, але была задзірыстая і магла адказаць на абразу. Асаблівых праблемаў не было: мяне заўсёды ўсе любілі. Я б сказала, нават наадварот: на мяне звярталі ўвагу, я адчувала сваю выключнасць.

— Ці часта даводзіцца сутыкацца з негатыўнай рэакцыяй?

— Да мяне на тэлевізію часта прыходзяць такія лісты, але мне іх чытаць не даюць. За ўвесь час далі толькі адзін — ад нейкай дзяўчыны, якая вельмі смешна аблажыла мяне мацюкамі на паперы. У апошні час, пакуль у метро да тэлевізіі праедзеш тры прыпынкі, ужо ўвесь вагон глядзіць. Некаторыя па-добраму ўсміхаюцца, а маладыя дзяўчаты часта з зайздрасцю шушукаюцца: «Ой, глядзіце, Грыбалёва пайшла!». А мне прыемна.

Гутарыла
Марына РАССАФОНАВА

АФІША

Віртуозы Інстытута сучасных ведаў

Інстытут сучасных ведаў — адна з найбольш вядомых мінскіх недзяржаўных ВНУ. Адна з цікавых асаблівасцяў інстытута — імкненне рыхтаваць спецыялістаў самых розных прафесій — ад бухгалтараў да артыстаў. Ёсць у ІСВ эстрадны факультэт, на якім атрымліваюць вышэйшую адукацыю, а значыць — адмысловую прафесійную падрыхтоўку, будучыя «зоркі». Сярод студэнтаў ёсць і тыя, хто ўжо заваяваў поспех на эстрадзе.

У якасці справаздачы аб сваёй рабоце 29 красавіка ў Канцэртнай зале філармоніі Інстытут сучасных ведаў праводзіць канцэрт сваіх выкладчыкаў і студэнтаў. На афішы — ужо знаёмыя імёны: В.Дайнэка, І.Афанасьева, Ліка, Тато Майсурадзэ. Можна спадзявацца, што і невядомыя пакуль шырокай публіцы артысты з ІСЗ — гэтай нашай кузні эстрадных кадраў — хутка выйдуць на шырокі шлях усенароднай любові. Акрамя спевакоў-салістаў, у канцэрце таксама возьмуць удзел калектывы навучэнцаў ІСВ — ансамбль народнага танца «Крыніца» і інструментальны ансамбль «Віртуозы».

ТЭАТРЫ

30 красавіка прадставіць на суд гледачоў новую імпрэзу Рускі тэатр. Гэта будзе «Раскіданае гняздо» Янкі Купалы. Рэжысёр-пастаноўшчык — мастацкі кіраўнік тэатра Барыс Луцэнка. У ягонай творчасці гэтая купалаўская п'еса займае асаблівае месца: у пастаноўцы Б.Луцэнкі «Раскіданае гняздо» ішло ў тэатры імя Янкі Купалы, а таксама быў зняты аднайменны мастацкі фільм.

У Рускім тэатры работу над гэтым класічным купалаўскім творам пачыналі адначасова з пастаноўкай новай п'есы Аляксея Дударава «У прыцемках», і па задуме стваральнікаў абодва спектаклі павінны раскрываць адну, вельмі надзённую тэму — праблемы нацыянальнага самавызначэння беларусаў. «Раскіданае гняздо» ў Рускім тэатры будзе ісці на беларускай мове, і ўдзельнікі спектакля не бачаць неабходнасці ў перакладзе. *«Наш тэатр называецца рускім, але ж гэта беларускі тэатр, ён імкнецца весці гутарку аб праблемах беларускай культуры і беларускага жыцця»*, — лічаць у тэатры.

Яшчэ адна прэм'ера наступнага тыдня — аперэта Ё.Штраўса «Цыганскі барон» у Тэатры музычнай камедыі, якая таксама адбудзецца 30 красавіка.

У тэатры імя Янкі Купалы 25 красавіка пройдзе «Ромул Вялікі», 26-га «Касцюмер», 30-га «Ажаніцца — не журыцца». На Малой сцэне 26 і 30 красавіка можна паглядзець «Чароўную ноч».

Маладзёжны тэатр пакажа 25-га «Рычарда», 26-га «Макбета», 30-га «Заложніцу кахання». Малы тэатр запрашае 28 красавіка на «Дрэйфуса», 29 — на «Камедыю» (спектаклі пачынаюцца а 19-й гадзіне на сцэне Палаца культуры прафсаюзаў). У Тэатры оперы і балета 26 красавіка «Князь Ігар», 29-га «Яўгеній Анегін», 30-га «Карміна Бурана».

1 траўня Тэатр-студыя кінаакцёра запрашае паглядзець «Выкраданне Елены», а ў «Хрыстафоры» у гэты ж дзень пройдзе «Жэнефіс».

КЛАСІЧНАЯ МУЗЫКА

26 красавіка Дзяржаўны акадэмічны сімфанічны арекстр і Дзяржаўная акадэмічная харавая капэла імя Р.Шырмы прадставяць «Рэквіем» А.Дворжака. 27-га адбудзецца вечарына з абанементнага цыклу «Садружнасць муз», на якой А.Ойстрах і Т.Старчанка, а таксама Дзяржаўны камерны аркестр і ансамбль «Камерата» павядуць гутарку на тэму «Мацарціянства ў мастацтве». Пачатак — а 18-й гадзіне. 1 траўня адмыслова для тых, хто святкуе Першамай, у Канцэртнай зале філармоніі пройдзе вялікі святочны канцэрт з удзелам аркестра духавых інструментаў «Няміга», Дзяржаўнага Камернага аркестра і ансамбля «Камерата». Салістка — Н.Ткачэнка (Масква). У праграме творы Чайкоўскага, Рымскага-Корсакава, Вэрдзі, Бізэ, Грыга.

Зала камернай музыкі запрашае 25 красавіка на канцэрт А.Подава (скрыпка) і А.Афанасьевай (фартэпіяна). 26 красавіка тут выступіць Духавы квінтэт маскоўскага тэатра «Новая опера», 28-га будзе спяваць Капэла хлопчыкаў Рэспубліканскага ліцэя пры Беларускай акадэміі музыкі. 1 траўня пройдзе праграма, складзеная з камерных твораў І.Брамса.

ГАСТРОЛІ

27 красавіка ў кінатэатры «Кастрычнік» выступіць рок-гурт «Арыя». Пачатак а 19-й гадзіне, кошт квіткоў 150—400 тысяч рублёў.

30 красавіка ў Мінск прыедзе «Акварыум». Да 25-годдзя гурта Барыс Грабеншчыкоў і ягоныя хлопцы падрыхтавалі зборную праграму *The best of Б.Г.* — відаць, прыхільнікаў «Акварыума» чакаюць самыя любімыя кампазіцыі. Канцэрт адбудзецца ў зале «Мінск», квіткі каштуюць ад 160 да 360 тысяч рублёў, пачатак а 19-й гадзіне.

У гэты ж дзень (30 красавіка) у «Кастрычніку» будуць выступаць «Иванушки International». Пачатак а 19-й гадзіне, квіткі прадаюцца за 200–300 тысяч рублёў.

ВЫСТАВЫ

Дзіцячая мастацкая акадэмія прадстаўляе выставу «Вясна і надзея», на якой можна ўбачыць творы вельмі цікавай галіны мастацтва — батыка (батык — гэта мастацкі роспіс тканін). Выставу складаюць работы мастака Алы Свірыдзенка і яе вучаніц, адчынілася яна ў Мінскім мастацкім ліцэі (вул.Камуністычная, 52).

Саюз мастакоў Беларусі адкрывае 24 красавіка ў Палацы мастацтва вялікую выставу «Чарнобыль. Боль, надзея».

Ганна ШЫМЕЛЕВІЧ

Дзе купіць касету з любімымі запісамі

Пасля таго, як у канцы мінулага лета было зачыненае Радыё 101,2, якое рэгулярна праводзіла беларускія хіт-парады, у аматараў беларускай музыкі застаўся адзін варыянт — слухаць запісы любімых выканаўцаў на касетах.

Ёсць, праўда, у Мінску яшчэ радыё *Бі-Эй*, але калі не ведаць, што гэтая радыёстанцыя беларуская па месцы знаходжання, то, паслухаўшы змест, можна падумаць, што перадаюць з якога-небудзь Тамбова ці Ніжняга Тагіла.

Намаганнямі такіх фірм, як «Ковчег», *Vigma*, *Top-Records*, «Саціс» і інш., запісаныя і з'явіліся ў продажы больш за 70 беларускамоўных касет. Спектр шырокі — ад року і бардаў да беларускіх народных казак. На магнітнай стужцы — такія вядомыя выканаўцы, як Данчык, Вольга Цярэшчанка, Андрэй Мельнікаў, Віктар Шалкевіч, гурты «Крама», *NRM*, «Бонда», «Новае неба», «Уліс», «Ліцьвіны», беларускія народныя казкі, беларуская гітарная музыка, беларуская класічная музыка, а таксама шмат яшчэ малавядомых, але вельмі цікавых выканаўцаў, чые запісы раней не выходзілі.

